УДК 378.017.4+378.4:[008+7](476-25)

# ПАТРЫЯТЫЗМ ЯК КАШТОЎНАСЦЬ І ЗАДАЧЫ ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ
## (Вопыт работы калектыву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў)



*Ва ўмовах сучасных глабалізацыйных і культурных выклікаў захаванне моўнай і нацыянальнай ідэнтычнасці, выхаванне ў асобы патрыятычных пачуццяў і перакананняў з'яўляюцца важнейшымі задачамі дзяржавы па рэалізацыі яе інтарэсаў, умацаванні суверэнітэту, забеспячэнні прагрэсу. Напярэдадні значнай для нашай краіны падзеі – 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне мы сустрэліся з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, старшынёй рэдакцыйнага савета часопіса Ю. П. Бондарам, каб даведацца, што такое сёння патрыятызм і якія мерапрыемствы па выхаванні патрыятызму ў моладзі праводзяцца ва ўніверсітэце.*

**– Юрый Паўлавіч, вельмі цікава Ваша меркаванне аб значнасці патрыятычнага выхавання ў сучасных умовах. Наколькі сёння актуальная гэта праблема?**

– У першую чаргу адзначу, што прыхільнасць да каштоўнасцей нацыянальнай культуры, патрыятычныя настроі і матывы дзейнасці з'яўляюцца важным аспектам грамадскай свядомасці сучасных беларусаў, як і іншых народаў свету. Кажучы аб сутнасці патрыятызму, важна адзначыць, што ён трактуецца як маральны імператыў і палітычны прынцып, заснаваны на ідэі прысвячэння свайго жыцця на карысць Радзімы.

Сапраўдны патрыятызм – гэта ўзвышаючае чалавека пачуццё нацыянальнага гонару, любові да Айчыны, шчырае імкненне справамі ўмацоўваць дабрабыт дзяржавы, рэалізоўваць яе інтарэсы, трансліраваць і ўзбагачаць яе каштоўнасці.

Сапраўдны патрыятызм праяўляецца не толькі ў экстрэмальных жыццёвых абставінах. Як феномен культуры і фундаментальная якасць асобы патрыятызм шматгранны. Ён заяўляе пра сябе ў жыццёвай палітры ўчынкаў, сацыяльна-карысных, творчых і прадуктыўных дзеяннях: адданасці і любові да Айчыны; абароне і ўмацаванні культурнага іміджу дзяржавы; павазе да гісторыі і духоўных каштоўнасцей народа; непрыманні нацыяналістычных пагроз і выклікаў, радыкалізму і экстрэмізму; садзейнічанні прагрэсу грамадства і грамадзянскай згодзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, патрыятызм – стрыжань ідэалогіі нашай дзяржавы, рухавік сацыяльнай мадэрнізацыі, гарант стабільнага развіцця. Ён грунтуецца на цэласным зборы ідэй, ідэалаў і норм, якія інтэгруюць грамадства, умацоўваюць грамадзянскую адказнасць і асабістае дачыненне да лёсу краіны.

Гістарычная памяць грамадства – гарант яго стабільнасці і духоўна-маральнага здароўя. Веданне мінулага сваёй краіны, а праз яго гісторыі «малой Радзімы», сям'і, продкаў, – гэта той грунт, на якім фарміруецца нацыянальная і культурная ідэнтычнасць чалавека, яго ўсведамленне сябе і свайго месца як у грамадстве, так і ў часе. Любоў да Радзімы Францыск Скарына лічыў самым высокім духоўным пачуццём чалавека. Якуб Колас пісаў, што няма ў чалавека нічога больш прыгожага і даражэйшага за Радзіму. У гэтых лаканічных меркаваннях заключаны глыбокі сэнс. Стаць цывілізаваным немагчыма па-за Радзімай, не зазнаўшы любові да яе, павагі да яе гісторыі і культуры, без дзейнага ўдзелу ў вырашэнні яе праблем і цяжкасцей.

Удзячная памяць міралюбівага чалавецтва захоўвае сімвал сусветна-гістарычнага значэння – нязгасны подзвіг савецкага народа і яго ўзброеных сіл у Вялікай Айчыннай вайне. Гэта даніна глыбокай павагі да подзвігу ў імя жыцця і прагрэсу. Разам з тым гэтая памяць – урок, папярэджанне тым, хто імкнецца перапісаць гісторыю, фальсіфікуе ролю СССР у разгроме фашызму, скіраваны да геапалітычнага панавання, паверыў у рэальнасць агрэсіўных планаў і задум.

Сусветная гісторыя захавала на стагоддзі гераічныя дзеянні і незаменныя страты савецкага чалавека на фронце і ў тыле ворага, яго здзяйсненні і нягоды, мужнасць і драматызм. Нязгасная памяць аб падзеях мінулага падахвочвае нас да разваг пра каштоўнасці жыцця, перабудову свету на справядлівых пачатках, пра вытокі і сродкі папярэджання варожасці і канфліктаў паміж народамі і дзяржавамі.

**– Раскажыце, калі ласка, пра найбольш важныя напрамкі і формы патрыятычнага выхавання моладзі ў навучальным працэсе ўніверсітэта.**

– Патрыятычнае выхаванне, фарміраванне ў моладзі гістарычнай памяці з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Педагагічны калектыў улічвае ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе своеасаблівасць гісторыі і культуры Беларусі, якая знаходзіцца на памежжы Усходу і Захаду Еўропы і прайшла доўгі і складаны шлях да дзяржаўнага суверэнітэту, на працягу стагоддзяў была арэнай ваенных дзеянняў, зведала спусташэнні, акупацыю, генацыд, тэрытарыяльныя страты і перакройванне меж.

Напярэдадні вайны Беларусь спазнала тэрытарыяльныя змены, зрабілася памежнай тэрыторыяй, прыняла на сябе першы ўдар. Потым краіна апынулася пад акупацыяй, стала арэнай генацыду, а яе зямля – інтэрнацыянальнымі могілкамі. З другога боку, Беларусь – краіна партызанскага і падпольнага руху, які адцягваў значныя сілы германскіх войскаў. Беларусь, як і іншыя рэспублікі СССР, – адна са стваральніц Перамогі. Трэць яе грамадзян загінула, абараняючы Радзіму. Унёсак рэс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікі быў належна ацэнены сусветнай супольнасцю. Яна стала адной з краін – заснавальніц ААН.

Увага студэнтаў акцэнтуецца на галоўных падзеях і пытаннях гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якія перакручваюцца некаторымі даследчыкамі і ідэолагамі, на вытоках мужнасці і гераізму савецкага чалавека, пытаннях, якія даюць магчымасць усвядоміць прычыны, падзеі, вынікі і ўрокі процiборства з фашыстамі.

Прыемна ўсведамляць, што нашы маладыя грамадзяне, валодаючы ведамі аб ваенным ліхалецці па падручніках і творах мастацтва, праяўляюць жывую цікавасць да гераічных і трагічных старонак гісторыі свайго народа.

Выкладчыкі тлумачаць падзеі і праблемы вайны, якія з'яўляюцца сёння арэнай навуковых і ідэалагічных спрэчак. Гэта эпізоды і факты дыпламатычнай гісторыі даваеннага перыяду і складанасці адносін СССР і еўрапейскіх краін, падзел сфер уплыву і рэальныя геапалітычныя інтарэсы дзяржаў у перадваенны і пасляваенны час, пытанні адказнасці за падрыхтоўку і развязванне вайны, вырашальнай ролі СССР у разгроме агрэсараў.

Для выхавання грамадзяніна і патрыёта стварэнне гістарычных міфаў з лакіроўкай і белымі плямамі – надзвычай дрэнны і небяспечны сродак. Як паказала практыка перыяду разбурэння СССР і станаўлення постсавецкага грамадства, гістарычныя ўмоўчванні і фальсіфікацыі не знікалі бясследна. Яны пакідалі пасля сябе гістарычны і грамадзянскі негатывізм, цынізм, недавер, цяжкі псіхалагічны шок і абразу людзей, якія давяралі прачытанаму і пачутаму. А яшчэ – калі праўду не скажа той, хто павінен, яе скажа іншы, але так, як яму патрэбна.

Таму ведаць сваю гісторыю неабходна, і такой, як яна ёсць. Зразумець, чаму так было і чаго гэта каштавала. Без разумення праблем, трагедый і нават «непрыгожых» эпізодаў нельга ўсвядоміць, наколькі было цяжка ў свой час як дзяржаве, так і людзям, а ведаючы – зразумець і асэнсаваць.

**– Якія змястоўныя моманты можна адзначыць у мадэлі адукацыі, якая рэалізуецца ва ўніверсітэце?**

– Аб'ектыўная рэальнасць падахвочвае нас да актывізацыі маральна-патрыятычнага выхавання, абнаўлення асобасна-прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

Калектыў універсітэта паспяхова рэалізуе інавацыйную мадэль фарміравання кампетэнтнасці спецыяліста. Яе каштоўнасны змест заключаецца ў далучэнні студэнтаў да дэмакратычнай культуры паводзін і адносін, стымуляванні іх нецярпімасці да праяў нацыяналізму, павагі да культуры народаў, краін і рэгіёнаў свету, гатоўнасці рэальнымі справамі памнажаць дасягненні і пераадольваць праблемы нашага грамадства.

Мы паступілі правільна, зарыентаваўшы адукацыйна-выхаваўчы працэс на фарміраванне спецыяліста, адаптыўнага да патрэб сацыяльнай мадэрнізацыі Беларусі, запытаў інфармацыйнай эпохі, дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі.

Па нашых назіраннях, узрастае цікавасць студэнтаў да нацыянальных традыцый, рэалій быцця, узораў гераічных здзяйсненняў савецкага чалавека ў Вялікай Айчыннай вайне і ў цяжкія гады аднаўлення народ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най гаспадаркі. Да месца адзначыць таксама тое, што мадэрнізацыя нашага грамадства з яе дасягненнямі, праблемамі і цяжкасцямі ўспрымаецца маладымі грамадзянамі з разуменнем, жаданнем спазнаць ісціну, абапіраючыся на сукупнасць дакладных фактаў.

Аналіз нашай адукацыйнай мадэлі выявіў алгарытм дзеянняў, спрыяльных для патрыятычнага выхавання: аздараўленне культурнага асяроддзя ўніверсітэта – укараненне інтэрактыўных метадаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці – удасканаленне форм ідэйна-выхаваўчай і культурна-творчай працы – комплекснае развіццё якасцей асобы спецыяліста – уцягненне студэнтаў у грамадскую дзейнасць – стымуляванне якаснага навучання і самаадукацыі.

Апрабацыя гэтага алгарытму ва ўніверсітэце пераконвае ў тым, што найбольш прадуктыўны сродак выхавання патрыятычных пачуццяў і ідэйнай перакананасці – канструктыўны дыялог у абмеркаванні гісторыі, тэорыі, тэндэнцый і праблем айчыннай культуры, яе ролі ў ажыццяўленні дзяржаўнай палітыкі рэформ.

Прынцыпова важна, каб дыялог адлюстроўваў непарыўную ўзаемасувязь тэорыі і практыкі, заахвочваў да зацікаўленага асэнсавання дынамікі сацыяльна-культурнага развіцця беларускага грамадства, папаўняў багаж інавацыйных ведаў, навыкаў і ўменняў будучага спецыяліста. З цікавасцю ўспрымаюцца студэнтамі творча-пошукавыя заданні, звязаныя з сучаснай рэчаіснасцю: аналізам стану і зместу нацыянальнай культуры; удасканаленнем тэхналогій кіравання культурнымі працэсамі; выяўленнем тэндэнцый і заканамернасцей трансфармацыі беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі; аптымізацыяй інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці ўстаноў культуры; пошукам навукова абгрунтаваных арганізацыйна-кіраўнічых рашэнняў у канкрэтных прафесійных сітуацыях і абставінах; паляпшэннем камунікацыі кадраў культуры з інстытутамі дзяржавы і грамадзянскай супольнасці.

**– Як Вы ацэньваеце значэнне і ўзровень выкладання ва ўніверсітэце курса «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»?**

– Неабходна падкрэсліць пазітыўнае значэнне шматгадовага выкладання ва ўніверсітэце гэтага курса. Гэта – мацнейшы сродак грамадзянскага выхавання студэнтаў. Дзякуючы новым распрацоўкам сучаснай гістарычнай навукі, прапановам розных пунктаў гледжання, дэманстрацыі кінаматэрыялаў студэнты маюць магчымасць апынуцца ў ваеннай эпосе, перажыць яе трагічныя моманты, па-іншаму зразумець сябе і свет, у якім жывуць. Важна, каб маладыя людзі зразумелі, што прырашчэнне ведаў, самаадукацыя, супастаўленне розных крыніц інфармацыі – гэта сродак супраць фальсіфікацый і маніпуліравання свядомасцю.

Эфектыўным сродкам як навучання, так і выхавання з моцным уздзеяннем на пачуцці стала напісанне ў рамках выкладаемага курса творчага задання – «Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям’і», што дазволіла праз гісторыю асобы, сям’і, вёскі ці горада далучыцца да гісторыі дзяржавы. Студэнты ўніверсітэта, якія праходзяць падрыхтоўку па спецыяльнасці «музеязнаўства», маюць магчымасць працаваць з аўтэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычнымі гістарычнымі матэрыяламі, дакументамі, артэфактамі ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, што дапамагае на практыцы атрымаць новыя веды.

**– У якой ступені, на Ваш погляд, даследчыя праграмы, якія рэалізуюцца ва ўніверсітэце, звязаны з рашэннем практычных задач па патрыятычным выхаванні моладзі?**

– У першую чаргу, хачу звярнуць увагу на тэматычную накіраванасць студэнцкай навукі ва ўніверсітэце. Цікавасць да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і нядаўняга мінулага ў моладзі відавочна, што пацвярджаецца актыўным удзелам студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў універсітэта ў XL канферэнцыі «Нацыянальная культура вачыма маладых», прысвечанай 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, якая адбылася 26 сакавіка. Жаданне даведацца і неабыякавасць праявіліся ў моладзі пры вывучэнні навуковай і мемуарнай літаратуры, падрыхтоўцы дакладаў і паведамленняў. Знаёмства з гістарычнымі матэрыяламі, класічнымі і сучаснымі даследаваннямі ваеннай гісторыі, архіўнымі дакументамі і магчымасць падзяліцца сваімі ведамі паспрыялі ў выхаванні патрыятызму.

У ходзе даследчай працы ў моладзі мацнее разуменне таго, што ў аснове духоўнага адзінства беларускага народа перад тварам страшнай пагрозы фашызму – магутны культурны падмурак усходнеславянскай цывілізацыі, які аб’яднаў каштоўнасці і дасягненні брацкіх рускага, беларускага, украінскага народаў. У дакладах і паведамленнях падкрэсліваецца, што перамога ў вялікай бітве з фашызмам была дасягнута, абапіраючыся на гуманістычныя каштоўнасці, у якіх акумуляваліся працоўныя якасці жыцця народа, духоўна-маральны вопыт хрысціянства, маральныя і эстэтычныя асновы ўсходнеславянскай і іншых культур народаў СССР, дасягненні савецкай культуры ў галіне літаратуры, мастацтва, навукі, філасофіі. Навукова-гістарычная рэканструкцыя духоўнага і жыццёвага вопыту ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны паказвае, што менавіта гуманістычная культура, да якой далучаецца сучаснае студэнцтва Беларусі, з’яўляецца жыватворнай крыніцай патрыятызму і гераізму, трываласці і мужнасці, адвагі і доблесці савецкіх людзей у перыяд цяжкіх выпрабаванняў.

Лейтматывам разважанняў і ацэнак беларускай студэнцкай моладзі аб вайне з’яўляецца перакананне, што нам ні ў якім разе нельга згубіць маральную, духоўную перавагу над фашысцкімі і прафашысцкімі сіламі мінулага і сучаснасці, якая была заваявана на аснове каштоўнасцей гуманістычнай маралі, дасягненняў класічнага мастацтва і літаратуры.

**– Якія навуковыя мерапрыемствы юбілейнага году Перамогі прысвечаны гэтай памятнай падзеі?**

– У гэтым годзе ва ўніверсітэце праводзіцца шэраг навуковых мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю Перамогі.

Так, IX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Культура. Навука. Творчасць», якая прайшла ва ўніверсітэце 5 мая, была прысвечана 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З дакладамі, прысвечанымі сацыякультурным і духоўна-маральным аспектам перамогі, увасабленню подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў мастацкай творчасці, выступілі вядомыя беларускія і замежныя навукоўцы: гісторыкі, палітолагі, філосафы, мастацтвазнаўцы, літаратуразнаўцы.

Таксама XXI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, праводзяцца па тэме «Патрыятызм як каштоўнасць усходнеславянскай культуры: да 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне».

Што датычыцца даследаванняў навукоўцаў універсітэта, то хачу адзначыць, што вынікі сацыялагічных апытанняў студэнтаў, нашы пастаянныя навучальныя і пазавучэбныя зносіны з імі пацвярджаюць патрыятычны настрой, пазітыўнае стаўленне беларускай моладзі да нацыянальнай культуры і гістарычнага мінулага свайго народа.





**– Якія грамадска-палітычныя акцыі і мастацка-эстэтычныя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею Перамогі, праводзяцца ва ўніверсітэце і ў іншых установах культуры, адукацыі, сацыяльнай дапамогі?**

– Важным напрамкам выхаваўчай дзейнасці калектыву ўніверсітэта з'яўляецца арганізацыя штогадовых мерапрыемстваў, прысвечаных памятным датам.

Так, кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры праводзіць конкурсы на лепшы мастацкі твор пра Вялікую Айчынную вайну.

Шэраг святочных мерапрыемстваў, якія прысвечаны подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, адбываюцца ў рамках штогадовага фестывалю мастацтваў «Арт-мажор» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэтыя канцэрты мастацкіх калектываў універсітэта адказваюць самым высокім мастацкім патрабаванням і задавальняюць патрабавальныя густы аматараў мастацтва. Не выпадкова яны праводзяцца на лепшых сцэнічных пляцоўках горада: у філармоніі, акадэмічным музычным тэатры, Маладзёжным тэатры эстрады, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» і прыцягваюць да сябе ўвагу грамадскасці нашай краіны і замежных гасцей.

Штогод рыхтуюцца тэматычныя мерапрыемствы, такія як тэатралізаваны мітынг-канцэрт «Касцёр памяці», канцэрт «Партызанскай агіт-





брыгады», тэатралізаваны святочны канцэрт «Боль пакаленняў», спектакль тэатра-студыі «7 паверх» па матывах аповесці Б. Васільева «Заўтра была вайна».

7 мая ў Маладзёжным тэатры эстрады адбылася прэм’ера музыкальна-публіцыстычнага праекта «За жизнь» (аўтар і рэжысёр – дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят А. Д. Вавілаў). Студэнты ўніверсітэта ў выразнай мастацкай форме перадалі сваё стаўленне да падзей Вялікай Айчыннай вайны: суперажыванне, захапленне і глыбокую павагу да моладзі ваеннага ліхалецця. Абапіраючыся на гістарычныя дакументы, юнакі і дзяўчаты ярка і пранікнёна ўвасобілі духоўны стан, пачуцці і перажыванні моладзі гераічнага ваеннага часу. Такі мастацка-публіцыстычны вопыт з’яўляецца прыкладам сувязі пакаленняў, захавання каштоўнасцей нацыянальнай гісторыі.

Ва ўніверсітэце ва ўрачыстыя дні арганізуюцца тэатралізаваныя пляцоўкі: «Ваенная тыпаграфія», «Палявы шпіталь», «Партызанскі штаб», «Палявая кухня» і інш.

29 красавіка напярэдадні святкавання 70-годдзя Вялікай Перамогі ў Гарадскім доме-інтэрнаце для ветэранаў вайны і працы «Світанак» адбыўся святочны дабрачынны канцэрт, падрыхтаваны нашымі студэнтамі. Калектывамі ўніверсітэта штогод праводзіцца шмат такіх сацыяльных мерапрыемстваў. Іх немагчыма пералічыць у адным інтэрв’ю.

**– На Вашу думку, якое маральнае значэнне мае знаёмства студэнцкай моладзі з матэрыяламі і сведчаннямі перыяду Вялікай Айчыннай вайны?**

– Вывучэнне падзей Вялікай Айчыннай вайны, біяграфій яе ўдзельнікаў, сустрэчы з ветэранамі ярка дэманструюць маладым людзям, што адданасць Радзіме, пачуццё патрыятызму, вернасць гуманістычным ідэалам і каштоўнасцям адыгралі вызначальную маральную ролю ў дасягненні перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Студэнцкая моладзь глыбей разумее той факт, што для дасягнення Вялікай Перамогі над фашызмам велізарнае значэнне мела не толькі інтэграцыя ваенных, матэрыяльных, эканамічных рэсурсаў нашай Радзімы. Не менш значнай падставай для Перамогі стала духоўнае адзінства і згуртаванасць прадстаўнікоў розных сацыяльных груп, нацый, народаў, пакаленняў. Вельмі важна было перамагчы фашызм ідэйна, атрымаць культурную, маральную, духоўную перамогу над злом, жорсткасцю, варварствам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**– Якія аспекты патрыятычнага выхавання моладзі рэалізуюцца ў кантэксце міжнароднай дзейнасці ўніверсітэта?**

– Важным аспектам нашай сістэмы патрыятычнага выхавання з'яўляюцца стабільныя міжнародныя сувязі, цеснае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, такімі вядучымі ўстановамі вышэйшай адукацыі, як Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут культуры, Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Дзяржаўны інстытут мастацтваў і культуры Узбекістана, Казахская нацыянальная акадэмія мастацтваў імя Т. К. Жургенава і інш. Не выпадкова, што ў гэтым годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў сумесна з Маскоўскім дзяржаўным інстытутам культуры праводзіць расійска-беларускую навукова-практычную канферэнцыю «Вялікая Айчынная вайна: гістарычная памяць і сучасныя падыходы да даследавання», асноўныя тэматычныя блокі якой уключаюць такія кірункі, як «Маральнае значэнне Перамогі над фашызмам», «Вялікая Айчынная вайна і ідэалагічныя фальсіфікацыі гісторыі», «Сучасныя ваенна-гістарычныя даследаванні».

**– У чым Вы бачыце далейшыя задачы і напрамкі ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі і павышэння грамадзянскай сталасці спецыялістаў сферы культуры?**

– Эфектыўнае патрыятычнае выхаванне прадугледжвае вырашэнне комплексу канцэптуальна-тэхналагічных задач: павышэнне якасці сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, мэтанакіраванае далучэнне студэнтаў да палітычных каштоўнасцей дзяржавы і нацыянальнай культуры; абнаўленне тэхналогій вучэбна-выхаваўчага працэсу з арыентацыяй на запыты грамадства і патрэбы спецыяліста сферы культуры; сучаснае інфармацыйна-аналітычнае і метадычнае забеспячэнне вучэбна-пазнавальнай практыкі; развіццё творча-пошукавага мыслення асобы на прыкладах мадэрнізацыі беларускага грамадства, рэалізацыі палітыкі і ідэалогіі суверэннай дзяржавы; прымяненне аб'ектыўных і гібкіх крытэрыяў ацэнкі засвоеных ведаў, навыкаў і ўменняў; удасканаленне кіравання вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю, самаадукацыяй студэнтаў.

**– Юрый Паўлавіч, што Вы хацелі б пажадаць нашым студэнтам, увогуле моладзі Беларусі?**

– Мне б хацелася, каб выпускнікі ўніверсітэта былі не толькі добра адукаванымі і прафесійна падрыхтаванымі спецыялістамі, але таксама шчырымі патрыётамі сваёй Радзімы, ведалі беларускую культуру, прапагандавалі яе каштоўнасці і дасягненні, знайшлі сваё годнае месца ў жыцці, былі б шчаслівыя, каханыя, вартыя сваіх продкаў, герояў Вялікай Айчыннай вайны.

Нашай моладзі трэба ўсведамляць, што ў сучасных умовах неабходна захаваць духоўнае адзінства брацкіх славянскіх народаў, фарміраваць у душах і розумах людзей усіх узростаў пачуццё дачынення да Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ